БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПЛАТФОРМА

ФОРУМУ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

# Заява Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства

## «Аб палітычным крызісе ў Беларусі, прызнанні Каардынацыйнай рады і дэлегаванні ёй паўнамоцтваў у перамовах з уладамі»

Менск 14.09.2020

Беларусая нацыянальная платформа Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства канстатуе, што Беларусь знаходзіцца ў стане палітычнага крызісу.

Мы бачым, што рашэнні і дзеянні, якія прымаюць прадстаўнікі дзяржаўных органаў, парушаюць правы грамадзянаў і вядуць да росту беззаконня і гвалту ў краіне.

Мы прызнаем адзіным прыймальным і цывілізаваным спосабам разрашэння сітуацыі перамовы паміж двума бакамі: прадстаўнікамі грамадства, якое пратэстуе, і прадстаўнікамі ўладных палітычных і сілавых структураў.

Мы прызнаем у якасці адзінага легітымнага прадстаўніка пратэстуючага боку Каардынацыйную раду па вырашэнні палітычнага крызісу, якая створаная па ініцыятыве Святланы Ціханоўскай.

Мы выказваем Каардынацыйнай радзе поўны давер і дэлегуем права прадстаўляць нашыя інтарэсы ў перамовах з беларускімі ўладамі па выкананні патрабаванняў, якія замацаваныя ў **Рэзалюцыі Каардынацыйнай рады** ад 19 жніўня 2020 года:

- Спыненне гвалту, спыненне палітычнага пераследу з боку ўладаў і правядзенне расследавання таго, што адбылося, у адпаведнасці з заканадаўствам.
- Вызваленне ўсіх палітычных зняволеных, адмена незаконных судовых пастановаў, выплата кампенсацыяў усім пацярпелым.
- Прызнанне прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня 2020 года несапраўднымі. Правядзенне новых выбараў паводле міжнародных стандартаў з новым складам усіх камісій па выбарах, уключаючы Цэнтральную камісію.

Мы падтрымліваем Рэзалюцыю Каардынацыйнай рады, якая сцвярджае, што адзіным спосабам пераадолення палітычнага крызісу з'яўляецца неадкладны пачатак перамоваў і выпрацоўка механізмаў для аднаўлення законнасці і правядзення новых выбараў. Ухіленне ад гэтых перамоваў ускладае на дзейную ўладу адказнасць за паглыбленне палітычнага і эканамічнага крызісу ў Рэспубліцы Беларусь.

Мы заклікаем усе сяброўскія арганізацыі БНП ФГС УП і іншыя арганізацыі грамадзянскай супольнасці Беларусі прызнаць Каардынацыйную раду адзіным легітычным прадстаўніком пратэстуючага боку і дэлегаваць права прадстаўляць свае інтарэсы ў перамовах з беларускімі уладамі.

facebook.com/BelarusNationalPlatformCSF
csfbelarus@gmail.com
npbelarus.info